# КАРТАГРАФІЧНЫ ВЭБ-ДАДАТАК «ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ ГОРАДА БРЭСТА»

**У. Д. ШЫЛКІНА**
*БрДУ імя А. С. Пушкіна, Брэст, Беларусь, ulyanashylkina@gmail.com*
*Навуковы кіраўнік - С. М. Такарчук, к.г.н., дацэнт*

**Уводзіны.** Сучасныя воблачныя тэхналогіі маюць вялікае значэнне ў сістэматызацыі і распаўсюджванні данных, у тым ліку геалакалізаваных. Картаграфічныя вэб-дадаткі характарызуюцца спалучэннем тэкставага і ілюстратыўнага матэрыялу, імгненным адлюстраваннем занесеных у вэб-прадукт змяненняў, неабмежаванай колькасцю карыстальнікаў, практычна бясплатнай дастаўкай і тыражыраваннем кантэнта, наяўнасцю ў публікацыях спасылак на іншыя крыніцы без абмежавання на месцазнаходжанне і інш. Такім чынам, выкарыстанне сучасных воблачных тэхналогій у мэтах візуалізацыі гарадскіх аб’ектаў прадстаўляе значную актуальнасць.

**Матэрыялы і метады.** Матэрыяламі для стварэння вэб-дадатка з’яўляюцца данныя Дзяржаўнага рэгістра інфармацыйных рэсурсаў Міністэрства Рэспублікі Беларусь, а таксама уласныя даследаванні. Асноўнымі метадамі сталі геаінфармацыйныя (элементы канструктара ArcGIS StoryMaps воблачнай платформы картаграфіравання ArcGIS Online).

**Вынікі і абмеркаванне.** На сённяшні дзень у межах горада Брэста да гісторыка-культурных каштоўнасцей (ГКК) адносяць 36 аб’ектаў, з іх 2 помнікі археалогіі, 23 помнікі архітэктуры, 5 помнікаў гісторыі, адзін помнік горадабудаўніцтва і 5 помнікаў мастацтва. Картаграфічны вэб-дадатак «Гісторыка-культурныя каштоўнасці горада Брэста» (https://arcg.is/zLz0K) мае складаную структуру. Па-першае, прылажэнне створана з выкарыстаннем розных элементаў канструктара ArcGIS StoryMaps. У прыватнасці, для яго стварэння выкарыстоўваліся такія элементы як «тэкст», «выявы», «кнопка», «раздзяляльнік», «слайд-шоу», «тур па карце», «экспрэс-карта».

Па-другое, вэб-дадатак аб’ядноўвае розныя тыпы прадстаўлення інфармацыі: (1) тэкставы матэрыял (агульная характарыстыка горада; характарыстыка паняцця «гісторыка-культурныя каштоўнасці»; апісанне гісторыка-культурных каштоўнасцей Брэста і інш.); (2) фатаграфічны матэрыял (фатаграфіі аб’ектаў (сучасныя і старыя); фатаграфіі мемарыяльных знакаў, усталяваных на будынках і помніках, і інш.); (3) картаграфічны матэрыял; (4) выявы ў выглядзе графікаў, дыяграм і схем.

Па-трэцяе, вэб-дадатак мае тэматычны змест, прадстаўлены ў выглядзе васьмі раздзелаў: «Брэст», «ГКК», «ГКК Брэста», «Помнікі археалогіі», «Помнікі архітэктуры», «Помнікі гісторыі», «Помнікі горадабудаўніцтва», «Помнікі мастацтва».

**Заключэнне.** Рэалізаваны картаграфічны вэб-дадатак з’яўляецца прыкладам ужывання воблачных тэхналогій у картаграфаванні гарадскіх гісторыка-культурных славутасцей.